# Памяці беларускага паэта і перакладчыка Пятра Прыходзькі

*Прыходзька Пятро нарадзіўся 25.02.1920 г. у вёсцы Альшоў Хоцімскага раёна Магілеўскай вобласці ў сялянскай сям'і.*

*У 1936 г. працаваў кіраўніком спраў Хоцімскага райкама камсамола. Пасля заканчэння Магілеўскага газетнага тэхнікума (1938) - адказны сакратар Хоцімскай раённай газеты «Калгасная звязда». У 1939 г., пасля заканчэння Хоцімскай сярэдняй школы, паступіў у Камуністычны інстытут журналістыкі імя С.М.Кірава ў Мінску. У 1940 г. прызваны ў Савецкую Армію. Удзельнічаў у баях на Бранскім фронце, на Курскай дузе, у вызваленні Беларусі, Польшчы, у баях за Берлін, за вызваленне Прагі. У пасляванны час (з 1947) працаваў у акруговай газеце «Во славу Родины» (Мінск), іншых ваенных газетах. У 1953 г. дэмабілізаваны. У 1956 г. скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. Працаваў у часопісе «Беларусь» (1953-1954), газетах «Звязда» (1956-1957), «Літаратура і мастацтва» (1957-1961), на Мінскай студыі дакументальных фільмаў (1961-1966). У 1967-1971 гг. - рэдактар выдавецтва «Беларусь», у 1972-1979 гг. - старшы рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура». Сябра СП СССР з 1947 г.*

*Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, двума ордэнамі Айчыннай вайны II ступені і медалямі.*

*Першы верш надрукавала ў 1936 г. Хоцімская раённая газета «Калгасная звязда»), у рэспубліканскім друку выступіў у 1937 г. (газета «Чырвоная змена»). Аўтар зборнікаў паэзіі «Голас сэрца» (1947), «Салдаты міру» (1951), «Ранак над Эльбай» (1952), «Пасля развітання» (1958), «Цёплы каравай» (1960), «Вішнёвы агонь» (1963), «Сонца раней узышло» (вершы і паэмы, 1967), «Калінавыя зоры» (вершы і паэма, 1969), «Прызнанне: Выбранае» (1970), «Не здадзеныя вышыні» (вершы і паэма, 1972), «На пераправе» (вершы і паэмы, 1974), «Лірыка» (1975), «Плацдарм» (вершы і паэма, 1978), «Лісты з паходаў» (выбранае, 1980), «Вячэрняя паверка» (вершы, балады, паэмы, 1982), «Парог памяці» (вершы, балады, паэмы, 1983), «Апаленыя вёрсты» (вершы, балада, паэма, 1986), «Водгулле грому» (1989), «Споведзь любові» (выбранае, 1990), «Па слядах маланкі» (1991), «Позняя восень» (вершы, паэмы, балады, 2001) і кнігі нарысаў «На новых землях» (з П.Багаценкавым, 1954). Для дзяцей выдаў зборнік вершаў «Сустрэча з маленствам» (1967), «Каляка-маляка» (1981), «Сцяблінка» (1986), паэму «Сын камунара» (1973), «Бярозавы лісток» (2001).*

*Перакладаў творы паэтаў народаў СССР. Лаўрэат Літаратурнай прэміі СП БССР імя А.Куляшова (1985) за зборнік «Парог памяці».*

# ...Я служыў свайму роднаму люду з першых дзён маладосці сваёй

*Над хатай адгрымелі навальніцы,*
*Расла і папаўнялася сям'я.*
*Але я веру, жывучы ў сталіцы,*
*Што вёска зноў адродзіцца мая!*

Дзе б ён ні быў яго заўсёды цягнула ў родныя мясціны.

«На карце Беларусі ў вярхоўі ракі Бесядзь, што бярэ пачатак у нетрах Смаленшчыны, абапал яе раскінуўся гарадскі пасёлак Хоцімск — былое правінцыйнае мястэчка.

Тут, у ціхім кутку беларускай зямлі, далёка ад чыгунак, паміж глухіх балот і лясоў да гарадского пасёлка прытулілася мая родная вёска Альшоў»,— гаварыў П. Прыходзька.

Дзяцінства яго было нялёгкім. Ён вельмі рана страціў маці — Марыю Яфімаўну. Яго бацька Фёдар Савельевіч у той час быў на грамадзянскай вайне (загінуў у пачатку Вялікай Айчыннай вайны). П. Прыходзька выхоўваўся пад наглядам дзеда і бабулі Пруднікавых.

Ўсё гэта П.Прыходзька апісаў у вершы «Мой рэквіем».

*Дваццаты год прагрукаў*
*капытамі*
*Па ўсёй крывёй залітай старане.*
*Не стала маці.*
*Дзед з бабуляй самі*
*Шчэ толькі месяцы лічылі мне.*
*Не бачыў я з калыскі, як у полі*
*Вярба раняла росы на труну.*
*Хавалі маці людзі з цяжкім болем,*
*Тых кленучы,*
*Хто пачынаў вайну.*
*А бацька?*
*Ваяваў салдатам дзесьці,*
*Застаўся удаўцом у час вайны.*
*З дзядулем, бабкай,*
*Каб далей крыж несці,*
*Мы засталіся гараваць адны...*

У пачатковую школу пайшоў у



сачыў за падзеямі, што адбываліся на Хоцімшчыне. Адрасоўваў чытачам наступныя радкі:

"Вельмі рады за ўсіх сваіх землякоў, іх поспехі ў працы і жыцці".

"Я вельмі шкадую, что не магу прыехаць як раней, у Хоцімск, наведаць родныя мясціны і сваіх землякоў. Апошні раз быў тут у 1990 годзе, адзначаў сваё 70-годдзе".

"Буду рады падтрымліваць з вамі сувязь да скону сваіх дзён".

Нягледзячы на ўзрост, на стан здароўя П.Ф. Прыходзька не пакідаў справу, якой прысвяціў жыццё. Кожны раз прапаноўваў чытачам усё новыя творы.

Апошні ліст ад паэта рэдакцыя атрымала ў жніўні мінулага года, у якім гаварылася наступнае:

"Пасылаю вам новы верш, перапісаны ад рукі, бо тут, дзе я зараз, няма пішучай машынкі. Я сябе адчуваю цяжка хворым (перанёс чацвёртую ў жыцці аперацыю), але вось працую, не забываю пра сваю малую радзіму.

Жадаю вам самага найлепшага ў жыцці і рабоце.

Ваш Пятро Прыходзька".

У 2001 годзе выходзіць асобным літаратурным выданнем паэма «Дар князёўны». Гэта паэма пра паходжанне Хоцімска. Ён хацеў, каб пра яго родны Хоцімск ведала ўся Беларусь. Рукапіс гэтай паэмы знаходзіцца ў гісторыка-краязнаўчым музеі Хоцімскай сярэдняй школы №1, з якім у яго былі добрыя адносіны.

Таксама ў музеі знаходзіцца рукапіс, прысвечаны аднаўленню Свята-Троіцкага сабора. У гэтым саборы яго хрысціла маці Марыя з дзедам Яхімам.

Жыццёвы шлях П. Прыходзькі



**П.Прыходзька з жонкай і дачкой.**

вёсцы Елавец. Дзе яго першай настаўніцай была родная маці Аркадзя Аляксандравіча Куляшова — Кацярына Фамінічна. Потым Пятро Прыходзька ўсе гады ўспамінаў яе.

Астатнія гады свайго юнацтва правёў у вёсцы Ліпаўка і ў Хоцімску, дзе закончыў сярэднюю школу. Даглядала яго ў гэты час родная цётка Наталля Ігнатаўна Прыходзька. Яна заўсёды ганарылася сваім пляменнікам, што той піша добрыя вершы.

Калі П. Прыходзька служыў у арміі і прыслаў ёй свае фота, яна ўсім паказвала які стаў яе сын, бо называла яго заўсёды сваім сынам.

Пасля заканчэння школы ён паступіў ў Магілёўскі газетны тэхнікум. Закончыўшы яго вярнуўся дадому і больш года працаваў адказным сакратаром раённай газеты «Калгасная звязда» (зараз «Шлях Кастрычніка»).

Свой першы верш «Стаханаўскі май» апублікаваў у гэтай газеце.Гэта здарылася ў 1936 годзе.

У 1939 годзе паступіў ў інстытут журналістыкі імя С.М. Кірава ў Мінску.

Але ў 1940 годзе ён быў прызваны ў армію, дзе яго застала вайна.

Пятро Прыходзька Вялікую Айчынную вайну прайшоў ад пачатку да канца, ад Сталінграда да Берліна. Служыў спачатку палітруком роты, потым сакратаром дывізійнай газеты. У 1943 годзе, калі пачалося вызваленне Беларусі ад нямецка- фашысцкіх захопнікаў камандаванне і палітаддзел 81-й стралковай дывізіі даручылі яму пісаць баявую гісторыю часці.

Першы ордэн Чырвонай Зоркі яму ўручаў сам генерал-маёр А. А. Казаран.

Яго перапаўняла шчасце,калі вызвалілі родны Хоцімск.

*Сорак трэці нам*
*год на змярканні*
*Лістападам дарогу ўсцілаў.*
*Чуў я сэрцам Радзімы дыханне,*
*Як Дняпро браў са зброяй ўплаў.*

«Добры дзень, родная Беларусь! Мы прыйшлі. Мы вярнуліся да цябе. Прабач, што затрымаліся ў паходзе. Трэба ж было прайсці сотні, тысячы кіламетраў, каб вярнуцца назад. А якія гэта былі кіламетры — ты сама добра ведаеш, родная зямля. Нялёгка было табе. Нялёгка было і нам. Але мы падзелімся бядой, горам і славай», — пісаў у сваім дзённіку П. Прыходзька.

Яго дывізія адной з першых прыняла зводку савінфармбюро з загадам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага аб капітуляцыі Германіі. Прымаў зводку адказны сакратар дывізійнай газеты «Призыв Родины» Пятро Прыходзька.

Нялёгкі салдацкі шлях паэта закончыўся ў Берліне.

Усё гэта ён апісаў у баладзе «Над апошнім полем боя».

*Ты помніш, дружа? Мы з табою*
*Пачулі светлым майскім днём,*
*Як над апошнім полем бою*
*Прагрукатаў першы весні гром...*
*...*
*І ў гэты дзень пад сонцам мая,*
*Што мір планеце ўсёй прынёс,*
*Мы сэрцам і душой прымаем*
*Мільёнаў матак горач слёз.*
*І як бы май з дняпроўскай стромы*
*Ні заглядаў у вокны хат,*
*Ніколі аддзяляць яго мы*
*Не будзем ад святочных дат!*

У пасляваенны час П. Прыходзька працаваў у акруговай газеце «Во славу Родины» горада Мінска, а таксама супрацоўнічаў з іншымі ваеннымі газетамі.

Увесь гэты час ён знаходзіўся на службе і дэмабілізаваўся толькі ў 1953 годзе.




**Апошні зборнік вершаў, паэм, балад.**

У гэты перыяд выйшлі яго зборнікі паэзій «Голас сэрца», «Салдаты міра», «Ранак над Эльбай». Усе яны былі на ваенную тэматыку.

Ён не мог змірыцца з тым, колькі гора прынесла вайна ўсяму народу.

Працуючы ў часопісе «Беларусь», а потым у газетах «Звязда», «Літаратура і мастацтва» П. Прыходзька аб'ездзіў амаль увесь Савецкі Саюз. Усё ўбачанае ён адлюстраваў у сваіх вершах і паэмах.

У 1985 годзе П. Прыходзька стаў лаўрэатам Літаратурнай прэміі СП БССР імя А. Куляшова за зборнік «Парог памяці». Але дзе б ён ні быў, ён ўсёроўна памятаў аб сваім родным куточку — Хоцімшчыне.

***Мой родны кут —***
***Мой гарадскі пасёлак.***
***Усю павагу аддаю яму.***
***Іду сюды***
***Па бальшаках, па сёлах***
***З зімы — у лета,***
***З лета — у зіму.***

На працягу многіх гадоў вёў перапіску з рэдакцыяй раённай газеты "Шлях Кастрычніка" наш зямляк, беларускі паэт Пятро Фёдаравіч Прыходзька.

Кожнае пісьмо было прасякнута любоўю да сваёй малой радзімы. У многіх сваіх творах услаўляў родныя сэрцу куточкі: в. Альшоў, р. Бесядзь,г.п. Хоцімск.

З цікавасцю П. Прыходзька быў нялёгкі: рана страціў маці, потым бацьку, прайшоў усю вайну, страціў жонку Зою Рыгораўну, дачку Людмілу, цяжка хварэў, перанёс некалькі аперацый.

«Але ж працаваць трэба, пакуль б'ецца сэрца», — пісаў паэт.

30 лістапада 2006 года Пятра Прыходзькі не стала.

***... Я хачу заўважаць, як на дол***
***З дрэваў падае восень лістамі.***
***І ўсё тое, што ззяе вакол,***
***Бачыць толькі сваімі вачамі!***

***P.S. Выказваем шчырую падзяку настаўніку гісторыі і кіраўніку гісторыка-краязнаўчага музея САШ №1 Валянціне Іванаўне БАУРЫНАЙ за прадастаўленне матэрыялаў.***




**У музеі сярэдняй школы №1.**

**Старонку падрыхтавалі**
**Канстанцін АНДРЭЭЎ і Аляксандр ЯРОМІН.**

**Андрэеў, К.** Я служыў свайму роднаму люду : [пра паэта-земляка П. Прыходзьку] / К. Андрээў, А. Яромін // Шлях Кастрычніка. — 2007. — 24 студзеня. — С. 3.